никам проекта получить навыки по а также развить их способность и готовность вести диалог с туристами. Кроме этого, отобранные из числа местных жителей волонтеры познакомились с трудовой и повседневной жизнью археологического музея и в рамках своего пребывания наладили контакты с сотрудниками музея, которые они смогут использовать для будущего сотрудничества после окончания проекта. Таким образом, были налажены и укреплены связи между музеем и местным сообществом, организациями для сотрудничества.

Как показал опыт привлечение местного сообщество в сохранение памятников, создание системы учета, паспортизации и контроля памятников местным сообществом при координации работников музея дает положительные результаты как местным жителям, так и музейным работникам. С одной стороны, музей стал привлекать местных жителей, с другой обогащать тематические разделы музея. В ходе проекта были разработаны рекомендации по охране и поддержанию археологических памятников и собраны материалы для путеводителя «Знаменитые археологические памятники Сурхандарьи».

С осуществлением проектов в рамках программы впервые разрабатывается и устанавливается связь между музеем и махаллой, разрабатывается туристический маршрут по знаменитым археологическим памятникам юга Узбекистана. Налаживание взаимодействия ученых-исследователей, представителей местного сообщества и структур самоуправления станут первыми шагами на пути создания эффективного механизм защиты памятников историко-культурного наследия силами общества.

**Новікаў С. Я.**

## МІЖНАРОДНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ МЕМАРЫЯЛЬНАГА КОМПЛЕКСУ «ТРАСЦЯНЕЦ»

***Ключавыя словы:*** аўстрыйскі помнік, Благаўшчына, Вялікі Трасцянец, Малы Трасцянец, масіў імёнаў, мемарыяльны комплекс «Трасцянец», Шашкоўка.

Набліжаецца 20-я гадавіна з моманту прыняцця Саветам Міністрам Рэспублікі Беларусь пастановы «Аб стварэнні мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» [1, с. 67]. За менш чым паўтара дзесяцігоддзі на месцы былога працоўнага лагера Малы Трасцянец каля аднайменнай вёскі побач з мінскім жылым мікраараёнам «Шабаны» адбылося афіцыйнае адкрыццё на вышэйшым дзяржаўным узроўні першай [2] і другой чэргаў [3] мемарыяла, на тэрыторыі якога

вясной 2019 г. быў уведзены ў строй міжнародны аб'ект памяці «Аўстрыйскі масіў імёнаў» [4]. Па цяперашні час тут, на месцы гістарычных падзей, яшчэ працягваюцца работы па ўшанаванні памяці аб той маштабнай трагедыі, якая ў гады германскай акупацыі крывёю тысяч бязвінных ахвяр, у тым ліку з Аўстрыі, Германіі і Чэхіі, назаўсёды ўпісана ў агульнаеўрапейскую памяць.

Як вынік, на сённяшні дзень каля вёсак Вялікі і Малы Трасцянец месцяцца практычна побач старыя і новыя помнікі айчыннага і замежнага паходжання, узведзеныя ў прывязцы да сумна вядомага гістарычнага месца, аднак не заўсёды адпавядаючыя канкрэтным аб'ектам ваеннага мінулага ці вядомым артэфактам трагедыі. Згаданыя супярэчнасці становяцца яшчэ больш відавочнымі, калі пачынаеш разглядаць падзеі мінулага, з аднаго боку, не толькі ў кантэксце даступных на цяперашні час шырокаму чытацкаму колу значнай колькасці дакументальных крыніц і гістарыяграфічных фактаў як айчыннага, так і замежнага паходжання, а з другога – відавочнага ўзмацнення інтарэсу да новага месца памяці ў турыстаў з розных краін, рознаўзроставых экскурсантаў, асабліва родзічаў ці землякоў загінуўшых тут замежных вязняў. Не кажучы пра тыя выклікі, якія чакаюць шараговых наведвальнікаў новага мемарыялу не толькі з яго супярэчлівым інфармацыйным наратывам, змешчаным на памятных дошках, але і ў кантэксце сусветнага навуковага досведу пра Халакост і розныя формы захавання памяці аб трагедыі яўрэяў на акупаванай тэрыторыі еўрапейскіх краін, у тым ліку ў Беларусі [5, с. 80; 6, с. 187].

Палітыкі, навукоўцы нашай краіны і шырокая грамадскасць, у тым ліку творчыя калектывы розных інстытуцый добра ўсведамляюць той гісторыка-культурны патэнцыял, якім валодае памяць пра мінулае як Трасцянца, так і пра безліч вядомых і безыменных ахвяр, агульная колькасць якіх па афіцыйных звестках складае 206,5 тысяч чалавек [7, с. 590]. Нагадаем чытачу, самы буйны на акупаваных усходняй тэрыторыі лагер масавага знішчэння каля вёскі Малы Трасцянец быў вядомы з канца 1980-х гадоў у замежнай гістарыяграфіі пад назвай «беларускі Асвенцім» [8, S. 91]. У апошні час у даследаваннях беларускіх [9; 10; 11; 12; 13; 14; 15; 25] і нямецкіх аўтараў [16; 17; 18; 19; 20; 21; 22], зборніках дакументаў і матэрыялаў [23; 24], каталогах выстаў [26; 27], а таксама на Internet-парталах [28; 29; 30] з'явіўся цэлы корпус звестак, якія фармуюць інфармацыйны наратыў аб гістарычных падзеях, што ў гады германскай акупацыі адбываліся каля Мінска ў раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец. Як вынік, можна сцвярджаць пра існаванне розных даследчыцкіх, пазнавальных і экскурсійных практык. Відавочна, што любы зацікаўлены чытач можа самастойна знайсці самую розную інфармацыю, каб на яе падставе паспрабаваць

складсі поўныя ці частковыя, праўдзівыя ці не дастаткова аб'ектыўныя ўяўленні пра трагічныя старонкі гісторыі лагера смерці Трасцянец, а таксама даведацца аб складаным працэсе мемарыялізацыі тых падзей не толькі ў пасляваенны, але і цяперашні часы.

Коратка нагадаем зацікаўленаму чытачу базавую версію, вядомую з савецкай гістарыяграфіі дзякуючы артыкулу В. П. Раманоўскага, апублікаванага ўпершыню ў 1990 г. у энцыклапедыі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне» [7]. З яго вынікала: Трасцянецкі лагер смерці быў створаны ў лістападзе 1941 г. каля вёскі Трасцянец Мінскага раёна для масавага знішчэння савецкіх грамадзян і ваеннапалонных, палітычных вязняў з еўрапейскіх турмаў і лагераў Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Францыі і Чэхаславакіі. Масавыя расстрэлы праводзіліся ва ўрочышчы Благаўшчына (да кастрычніка 1943 г. было знішчана 150 тыс. чалавек), затым ва ўрочышчы Шашкоўка (знішчана больш за 50 тыс. чалавек), дзе была створана спецыяльная яма-печ. Дастаўленыя ў канцы чэрвеня 1944 г. ахвяры з мінскіх турмаў і лагераў былі спалены ў калгасных хляве в. Малы Трасцянец і на штабелі дроў побач з ім (6,5 тыс. чалавек). Усяго ў Трасцяненцкім лагеры смерці знішчана 206,5 тыс. чалавек. Лагер па колькасці знішчаных людзей стаіць на 4-м месцы пасля Асвенціма, Майданека і Трэблінкі [7, с. 590].

У навукова-папулярным выданні «Экскурсія ў Трасцянец» (Мінск, 1986) супрацоўніца Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны А.Г. Ванькевіч фактычна ўпершыню знаёміла шырокую грамадскасць з фактамі, аснову якіх складалі афіцыйныя лічбы ахвяр у 206500 чалавек, устаноўленыя Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі ў выніку расследавання злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ваколіцах Мінска ў гады германскай акупацыі Беларусі 1941–1944 гг. Заўважым, што ў самым пачатку працы змешчана фота абеліска каля вёскі Вялікі Трасцянец, на фоне якога гарыць полымя вечнага агню (у апошнія гады закансервавана. – *С.Н.*) і на помніку высвечваецца мемарыяльная дошка з меншай лічбай у 201500 ахвяр.

Такім чынам, базавым палажэннем, замацаваным у беларускай савецкай і захаваным у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі, з'яўляецца навуковы тэзіс В.П. Раманоўскага аб масавым знішчэнні савецкіх грамадзян і ваеннапалонных, а таксама замежных палітычных вязняў у Трасцянецкім лагеры смерці агульнай колькасцю 206,5 тыс. чалавек. Пры тым, што лічбы, прынятыя на той час ў навуковым і замацаваныя ў грамадскім дыскурсе, не карэліравалі паміж сабой.

У 2003 г. прафесійнымі гісторыкамі, музейнымі работнікамі і архівістамі быў падрыхтаваны зборнік «Лагерь смерти Тростенец», які складалі 117 архіўных дакументаў і матэрыялаў. У навуковым звароце

замацоўваліся даныя, адпаведна якім у месцы масавага знішчэння ў гэтым раёне загінулі 206,5 тыс. чалавек [23, с. 116–117].

Такой жа лічбы прытрымліваюцца аўтары новага выдання «Тростенец. Трагедия народов Европы, память в Беларуси» [24, с. 7]. Таму для чытача будзе не зусім зразумелай новая лічба, якую ў мінулым годзе прапанавалі Н. А. Яцкевіч і М. Г. Нікіцін – аўтары новага навукова-папулярнага выдання «Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы» [25], якія ў дачыненні да дзейнасці спецыяльнай каманды-1005 і колькасці спаленых трупаў ў раёне вёскі Трасцянец Мінскага раёна сцвярджаюць наступнае: «У перыяд з кастрычніка 1943 г. па сакавік 1944 г. зондэркаманда «1005 Цэнтр» раскапала і спаліла ў Благаўшчыне 125 тысяч трупаў» [25, с. 23]. Адразу звернем увагу чытача на два істотна важных моманты ў прыведзенай цытаце: па-першае, на храналагічныя рамкі дзейнасці зондэркаманды, якія не пацвярджае ні адзін нямецкі дакумент; па-другое, на колькасць тых, хто быў спалены ў Благаўшчыне, што значна адрозніваецца ад звестак мінскай абласной камісіі садзейнічання Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі (НДзК). Як вядома, у дакуменце камісіі была прыведзена дакладная лічба ў 150 тысяч. Тады як аўтары названай працы не прыводзяць дакументальныя звесткі, з якіх бы вынікалі згаданыя новаўвядзенні, не тлумачаць прычыну змяншэння гэтай лічбы, асабліва без неабходных дакументальных доказаў. Аўтары не палічылі патрэбным зрабіць спасылку на архіўны ці іншы матэрыял, на падставе якога можна было б вызначыць больш працяглы тэрмін спальвання «зондэркамандай 1005–Цэнтр» ва ўрочышчы Благаўшчына, калі па дакументах судовага працэсу ў Гамбургу ў дачыненне да начальніка 9-й танкавай паліцэйскай роты старшага лейтэнанта О. Гольдапа, які называе дакладную дату апошняга дня работы каманды 15 снежня 1943 г.

Таму ў чытача ўзнікаюць лагічныя пытанні, на падставе якіх дакументальных крыніц уводзяцца ў навуковую, грамадскую і экскурсійную практыкі звесткі, якія адрозніваецца ад агульнапрынятых даных. Гэта надзвычай важна, паколькі новае выданне адрасавана не толькі беларускамоўным, але і англа- і рускамоўнай чытацкай аўдыторыі, г. зн. уводзіць факты беларускай ваеннай гісторыі ў еўрапейскі кантэкст, дзе на цяперашні час замацаваны ацэнкі, да якіх у ходзе даследавання згаданай праблематыкі прыйшлі ў сучаснай нямецкай гістарыяграфіі. І высновы нямецкіх даследчыкаў, у аснову якіх пакладзены дакументальныя крыніцы, істотна адрозніваюцца. Такім чынам, уведзеныя новыя лічбы не проста ставяць новыя пытанні, колькі ствараюць пэўныя праблемы.

Малавядомай для шырокага чытача на цяперашні момант застаецца практыка дзейнасці «зондераманады 1005-Цэнтр», назва якой

паходзіла ад чарговага ўліковага нумара ў бягучым справаводстве RSHA (Імперскага ведамства бяспекі Германіі), скіраваная на ліквідацыю слядоў масавых злачынстваў на акупаванай савецкай тэрыторыі, у тым ліку тэрыторыі Беларусі. Рэдкія звесткі, галоўным чынам ускоснага характару, сустракаюцца ў асобных дакументах Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі (НДзК) і фігуруюць у сведчаннях некаторых мясцовых жыхароў як прамых сведак тых падзей. Тады як падборка дакументальных матэрыялаў, апублікаваныя ў апошнія гады ў гісторыка-дакументальнай хроніцы гарадоў і раёнаў Беларусі па згаданай тэме, практычна абыходзіць маўчаннем ці не закранае гэты жахлівы факт ваеннай гісторыі Беларусі [13, с. 3–13].

У той жа час навуковы аналіз сведчанняў мясцовых жыхароў пераконвае ў тым, што падчас іх апытанняў прадстаўнікамі НДзК размова часцей за ўсё вялася толькі аб агульных, схематычна прадстаўленых рэчах, пры гэтым давалася выключна знешняя, а не ўнутраная характарыстыка падзей, пры гэтым не прыводзяцца канкрэтныя дэталі, без чаго практычна нельга было рэканструяваць тыя надзвычай своеасаблівыя падзеі, тым больш прывесці дакладныя звесткі, канкрэтныя факты, згадкі асобных імён і г.д. У гэтай сувязі ў даследчыкаў узнікалі прынцыпова важныя пытанні, наколькі згаданыя сведчанні адпавядаюць іншым дакументальным крыніцам, у якой ступені ўскосныя звесткі відавочцаў раскрываюць сутнасць гістарычных падзей і ці могуць яны вытрымаць праверку верыфікаванымі дакументамі. У выніку – ці могуць і надалей заставацца ў якасці адзіных дакументальных крыніц для ўсебаковага вывучэння гэтай малавядомай гістарычнай праблемы.

Другі бок праблемы па адэкватным выкарыстанні супярэчлівых дакументальных звестак, розных тлумачальных сімвалаў і нават супрацьлеглых моўных сродкаў у час правядзення экскурсій вынікае з розных падыходаў да фарміравання новай прасторы памяці, створанай у апошнія гады ў выніку незавершанасці планаў па ўвядзенні ў строй архітэктурных аб'ектаў Мемарыяльнага комплексу «Трасцянец».

Па ацэнках вядучага нямецкага спецыяліста ў сферы мемарыялізацыі падзей Халакосту К. Янеке, у сувязі з паходжаннем шматлікіх ахвяр з розных еўрапейскіх краін Трасцянец «з'яўляецца чыста еўрапейскім месцам памяці» [20, с. 10]. Еўрапейскасць гэтага месца памяці яшчэ больш узрасла пасля адкрыцця на афіцыйным дзяржаўным узроўні ў Трасцянцы аб'ектаў другой чаргі мемарыялу ва ўрочышчы Благаўшчына летам 2018 г., а таксама новага помніка «Аўстрыйскім ахвярам Халакосту» вясной 2019 г. [3; 4; 6].

Такім чынам, на цяперашні час у Мемарыяльным комплексе «Трасцянец» створаны значны патэнцыял гісторыі і памяці, які намаганнямі палітыкаў, навукоўцаў і экскурсаводаў пераўтвараецца ў

месца супольнай еўрапейскай памяці, становіцца адкрытым вакном магчымасцей для міжнароднага дыялогу. Кажучы інакш, на цяперашні час перад беларускім і замежным суб'ектамі і практыкамі стаяць новыя задачы не столькі па ўсебаковым вывучэнні і асэнсаванні асобных малавядомых фактаў у гісторыі трагедыі, колькі па забеспячэнні грамадскай патрэбы ў новым інфармацыйным наратыве, які мог бы істотна зблізіць погляды даследчыкаў, экскурсантаў і экскурсаводаў. На гэтым этапе спалучэнне ў архітэктурных аб'ектах нацыянальных практык ушанавання гістарычнай памяці ў Трасцянцы пераконвае ў тым, што нягледзячы на захаванне пэўных стэрэатыпаў у працэсе перадачы гістарычных ведаў кожны з мемарыяльных аб'ектаў павінен адпавядаць аб'ектыўным навуковым ведам аб трагедыі розных народаў Еўропы ў Трасцянцы. Такія падыходы становяцца надзвычай актуальнымі ў сувязі са з'яўленнем папулісцкіх матэрыялаў, якія часам пішуцца без уліку навуковых напрацовак айчынных і замежных гісторыкаў, а таксама цэлага комплексу новых гістарычных дакументаў, а таксама вузка тэматычных навуковых даследаванняў.

Адзначым у гэтым плане найноўшыя аўстрыйскае калектыўнае выданне «Масіў імёнаў» [19] і магісцерскую дысертацыю нямецкай даследчыцы Г. Поль на тэму «Ніхто не забыты, нішто не забыта? Мемарыялізацыя памяці пра Шоа ў Мінску і Малым Трасцянцы» [21], у фуксе якіх апынуліся гістарычных дакументы і найноўшыя навуковыя ацэнкі, прааналізаваныя пад вуглом не толькі еўрапейскіх даследчыцкіх практык, але і сучасных патрабаванняў да месцаў захавання памяці ў агульнаеўрапейскай прасторы. Практычны бок аналізу гэтых прац сведчыць не столькі пра імкненне глыбокай распрацоўкі тэмы і ўвядзенне малавядомых матэрыялаў у шырокі зварот, колькі ў неабходнасці іх адэкватнага выкарыстання ў працы турыстычных бюро, экскурсійных фірм і непасрэдна самімі экскурсантамі [6, с. 187].

Выпрацоўка адэкватных падыходаў да выкарыстання беларускай гісторыка-культурнай спадчыны ў адпаведнасці з агульнаеўрапейскімі патрабаваннямі ставіць на парадак дня важнае пытанне: нягледзячы ні на што, ці з'явіцца мемарыяльны комплекс «Трасцянец як сімвал трагедыі беларускага і яўрэйскага народаў з яго ўнікальным экскурсійным патэнцыялам на карце еўрапейскага і міжнароднага турызму?

1. Постановление № 654 Совета Министров Республики Беларусь «О создании мемориального комплекса «Тростенец» в г. Минске, 22 мая 2002 г. // Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси : документы и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.] ; редкол. : В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2016. – С. 394–400.

2. Информация об участии Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко в митинге-реквиеме «Врата памяти», 22 июня 2015 г. // Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси : документы и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.] ; редкол. : В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2016. – С. 445–447.
3. Лукашенко с президентами Германии и Австрии посетил мемориальный комплекс «Тростенец» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.belta.by/president/view/lukashenko-s-prezidentami-germanii-i-avstrii-poseschaet-memorialnyj-kompleks-trostenets-308766-2018/. – Дата доступу: 19.09.2021.
4. Президент Беларуси и федеральный канцлер Австрии открыли памятник жертвам нацизма «Массив имен» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.belta.by/president/view/prezident-belarusi-i-federalnyj-kantsler-avstrii-otkryli-pamjatnik-zhertvam-natsizma-massiv-imen-341860-2019/. – Дата доступу: 19.09.2021.
5. Валігурска, М. Памяць пра Халакост. На лініях разлому паміж усходне- і заходнееўрапейскай культурамі памяці. Новы мемарыяльны комплекс у Трасцянцы / М. Валігурска // ARCHE-Пачатак. – 2018. – № 3. – С. 80–96.
6. Новікаў, С. Я. Аўстрыйская канцэпцыя ўшанавання памяці ў Мемарыяльным комплексе «Трасцянец» / С. Я. Новікаў // Вестник МГЛУ. Серия 3 : История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – 2021. – № 20. – С. 181–187.
7. Раманоўскі, В. П. Трасцянецкі лагер смерці / В. П. Раманоўскі // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941–1945: Энцык. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – С. 591.
8. Kohl, P. Trostenez – das Auschwitz von Belorußland // Kohl, P. „Ich wundere mich, dass ich noch lebe“: sowjetische Augenzeugen berichten / P. Kohl. – Gütersloh: Gütersloher Verlag – Haus Mohn, 1990. – S. 91–103.
9. Тростенец / сост. С. В. Жумарь, Р. А. Черноглазова. – Минск : Полиграфоформление, 2003. – 103 с.
10. Yatskevich, N. Zur Gründung einer Gedenkstätte in Trostenez / N. Yatskevich // „Existiert das Ghetto noch?“. Weißrussland: Jüdisches Überleben gegen nationalsozialistische Herrschaft. Assoziation A. – Berlin ; Hamburg ; Göttingen : IBB Dortmund, 2003. – S. 246–247.
11. Кузнецов, И. Н. Тростенец: актуальные проблемы исследований / И. Н. Кузнецов // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 6 красавіка 2012 г. Вып. 12. У 2 т. Т. 1 / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2013. – С. 84–89.
12. Новікаў, С. Я. Урочышча Благаўшчына – месца масавага знішчэння людзей на тэрыторыі акупаванай Беларусі / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 10. – С. 21–27.
13. Новікаў, С. Я. Ліквідацыя слядоў масавых нацысцкіх злачынстваў у Беларусі ў 1943–1944 гг.: да пытання аб дзейнасці “зондэркаманды 1005-Цэнтр” // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 5. – С. 3–13.
14. Багданава, Г. П. Ахвяры і злачынцы нацысцкага лагера Малы Трасцянец: маламядомыя факты / Г. П. Багданава // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 6. – С. 13–13.
15. Кошман, В. И. Трагедия урочища Благовщина: анализ огнестрельного материала по итогам археологическихъ исследований 2017 года / В. И. Кошман //

Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 35. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – С. 189–203.
16. Kohl, P. Das Vernichtungslager Trostenez / P. Kohl. – Dortmund : IBB, 2003. – 112 S.
17. Rentrop, P. Tatorte der „Endlösung“. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungs-stätte von Maly Trostinez / P. Rentrop. – Berlin : Metropol, 2011. – 256 S.
18. Rentrop, P. Maly Trostinez – eine Landgut als Vernichtungsstätte / P. Rentrop // Im Schatten von Auschwitz. Spurensuche in Polen, Belarus und der Ukraine: Begegnen, erinnern, lernen. – Bonn : BPB. 2017. – S. 152–169.
19. DAS MASSIV DER NAMEN. Ein Denkmal für die Österreichischen Opfer der Shoa in Malz Trostinec / Hrsg. von Pia Schölnberger. – Wien : Czernin Verlag, 2019. – 168 S.
20. Янеке, К. Официальные германо-белорусские отношения 1990–2019 гг. в зеркале развития места памяти «Тростенец» / К. Янеке // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 5 красавіка 2019 г. Вып. 18. / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2020. – С. 4–13.
21. Pohl, G. Nikto ne zabyt, nisto ne zabyto? Memorialisierungen der Erinnerung an die Shoah in Minsk und Maly Ttoscjanec. Masterarbeit zur Erlangung des Akademischen Grades Master of Arts (M.A.) / G. Pohl. – Berlin, 2020. – 109 S.
22. Поль, Г. Мыслить в национальных категориях: «Массив имен» как мемориал «Автрийским жертвам Холокоста» / Г. Поль // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 3 красавіка 2020 г. Вып. 19 / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2021. – С. 55–65.
23. Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / Под ред. Г.Д. Кнатько. – Минск : НАРБ, 2003. – 292 с.
24. Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси : документы и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.] ; редкол.: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2016. – 520 с.
25. Яцкевіч, Н. А. Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы = Тростенец. Трагедия народов Европы = Trastsianets. The tragedy the peoples of Europe / Н. А. Яцкевіч, М. Г. Нікіцін. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 128 с.
26. Лагерь смерти Тростенец: история и память. Каталог передвижной выставки. – Берлин: МОЦ Дортмунд, 2016. – 246 с.
27. Vernichtungsort Maly Trostinez. Geschichte und Erinnerung. Katalog der deutsch-belarussischen Wanderausstellung. – Berlin: IBB Dortmund, 2016. – 246 S.
28. Досье: лагерь смерти Тростенец [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.belta.by/society/view/dose-lager-smerti-trostenets-308621-2018. – Дата доступу: 19.09.2021.
29. Лагерь смери Тростенец. Документы и материалы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://archives.gov.by/index.php?id=973276. – Дата доступу: 19.09.2021.
30. Выставка в БГУ с «Белой Русью» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://belayarus.by/news/glavnye-novosti/lager-smerti-trostenets-istoriya-i-pamyat. – Дата доступу: 19.09.2021.